навуковых даследаваннях, новыя прамысловыя каталогі і г.д.); БД як часткі інфармацыйных рэсурсаў, БД па прыродазнаўству, тэхніцы і сельскай гаспадарцы, якія генерыруюцца ў Беларусі, БД бліжняга і дальняга замежжа і іх выкарыстанню ў бібліятэках рэспублікі.

Практычная падрыхтоўка, на наш погляд, павінна прадугледжваць правядзенне заняткаў па фарміраванню баз дадзеных па прыродазнаўству, тэхніцы і сельскай гаспадарцы і іх выкарыстанню. Фарміраванне і актуалізацыя БД па тэхніцы, у прыватнасці па парашковай металургіі, прадугледжваюцца таму, што па гэтай галіне адпаведны кабінет ў дастаткова добрай ступені ўкамплектаваны інфармацыйнымі выданнямі. Створаную БД можна будзе выкарыстоўваць на лабараторных занятках па абслугоўванню карыстальнікаў у рэжыме выбіральнага распаўсюджвання інфармацыі.

Па прыродазнаўству студэнтаў неабходна навучыць весці пошук у БД «Прырода Беларусі», якую генерыруе ЦНБ АН Беларусі; па сельскай гаспадарцы ў БД «Agras» - базе дадзеных Цэнтральнай бібліятэкі Расійскай сельскагаспадарчай акадэміі, якую выкарыстоўвае БелСГБ.

4. Навучанне студэнтаў аўтаматызаваным тэхналогіям, у тым ліку і бібліяграфічным, стрымліваецца, у першую чаргу, недастатковай матэрыяльна-тэхнічнай базай факультэта. Камп'ютэрныя класы кафедры інфарматыкі не дазваляюць праводзіць усе неабходныя заняткі па бібліятэчных, бібліяграфічных і інфармацыйных курсах.Для актуалізацыі БД па парашковай металургіі неабходны новыя інфармацыйныя крыніцы, якія адсутнічаюць на кафедры ў сувязі з недахопам фінансавых сродкаў на іх набыццё. Па гэтай жа прычыне студэнты не могуць засвоіць самую сучасную інфармацыйную тэхналогію - БД на кампактных, аптычных дысках.

Другая прычына, якая стварае дадатковыя цяжкасці ўкаранення аўтаматызаваных тэхналогій, - слабая падрыхтаванасць выкладчыкаў для правядзення практычных заняткаў. Таму тэрмінова неабходны курсы па камп'ютэрнай падрыхтоўцы для выкладчыкаў бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін.

Саітава В.І.,
дацэнт

## КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧЭБНАГА ДАПАМОЖНІКА ПА «ГІСТОРЫІ СУСВЕТНАЙ БІБЛІЯГРАФІІ»

1. Курс «Гісторыя сусветнай бібліяграфіі» належыць да ліку дысцыплін, якія фарміруюць агульпрафесіянальны светапогляд будучых спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай справы. Курс быў уведзены ў час перабудовы структуры дысцыплін у сувязі са змяненнем сацыяльна-палітычных умоў, дэкларацыяй суверэнітэту Беларусі, пераходу на універсітэцкі ўзровень выкладання. У перыяд існавання СССР такая дысцыпліна не выкладалася (чыталася «Гісторыя бібліяграфіі», дзе раскрывалася развіццё бібліяграфічнай дзейнасці ў Расіі). На кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства створана праграма па курсу «Гісторыя сусветнай бібліяграфіі». Аналагаў гэтай праграмы ў краінах бліжняга замежжа няма.

2. Існуе комплекс тэарэтыка-метадалагіч-ных праблем, вырашэнне якіх неабходна для стварэння адпаведнага вучэбнага дапаможніка. Гэта вызначэнне аб'екта, асноўных метадаў адлюстравання матэрыялу, крыніц, формы.

Аб'ектам асвятлення будуць аргані-зацыйныя, тэарэтычныя, метадычныя дасягненні, прадукцыя бібліяграфіі, дзеячы, стан бібліяграфічнага абслугоўвання, бібліяграфічнай адукацыі ад пачатку яе ўзнікнення. Гісторыя бібліяграфіі будзе разглядацца ў сувязі з агульнай гісторыяй культуры і такіх сумежных галін, як гісторыя пісьменнасці, кнігадруку, бібліятэчнай справы і г.д. Па тэрытарыяльнай прыкмеце будзе прадстаўлена гісторыя бібліяграфіі Еўропы, Амерыкі, Азіі, з краін.бліжняга замежжа - Расіі, Літвы. Па тэрытарыяльнай прыкмеце «Гісторыя сусветнай бібліяграфіі» размежавана з курсам «Гісторыя беларускай бібліяграфіі».

У аснову адлюстравання матэрыялу будзе пакладзена храналагічная прыкмета. Існуюць значныя цяжкасці ў выбары схемы перыядызацыі паміж рознымі рэгіёнамі свету. Акрамя таго, немагчыма поўнае супадзенне перыядызацыі гісторыі бібліяграфіі з прынятай агульнагістарычнай перыядызацыяй; магчыма толькі пэўная адпаведнасць паміж імі. З улікам тэрытарыяльнай прыкметы (кантыненты, рэгіёны, краіны) матэрыял будзе падзяляцца на главы і параграфы. Будуць выкарыстаны таксама гісторыка-генетычны метад, метады параўнальнага аналізу і абагульнення, статыстычны. Асаблівае значэнне надаецца параўнальнаму метаду. Велізарныя храналагічныя і прасторавыя межы і адпаведна вельмі вялікія аб'ёмы бібліяграфічнага матэрыялу патрабуюць жорсткага адбору з'яў, фактаў, персаналій, канцэпцый і іншых складаючых бібліяграфічнай дзейнасці. Гэты адбор павінен забяспечыць аб'ектыўную характарыстыку развіцця бібліяграфіі ў пэўны перыяд, даць матэрыял для раскрыцця найбольш буйных кампанентаў бібліяграфічнай дзейнасці, а таксама тых з іх, якія найбольш паўплывалі на далейшы стан бібліяграфіі. Асаблівая ўвага будзе скіравана на выяўленне новага ў тэарэтыка-метадычным, арганізацыйным аспектах. Паўната характарыстыкі павінна залежыць ад гістарычнага значэння разглядаемага элемента і яго карысці для сучаснай бібліяграфічнай работы. Адсут-

часць самастойнага курса бібліяграфічнага крыніцазнаўства накладае на выкладчыкаў «Гісторыі сусветнай бібліяграфіі» маральны абавязак даць студэнтам крыніцазнаўчыя веды.

Аднак нават паралельны метад не пазбавіць ад значных страт матэрыялу: па-за межамі застануцца ў асноўным развіццё бібліяграфіі ў Афрыцы, Аўстраліі, шэрагу краін Цэнтральнай і Усходняй Азіі, гісторыя галіновай бібліяграфіі, ананімы і псеўданімы, краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя і некаторыя іншыя віды.

3. На жаль, мы пакуль што маем справу з дрэннай крыніцазнаўчай забяспечанасцю. Першыя невялічкія публікацыі па гісторыі бібліяграфіі з'явіліся ў 19 ст. Асноўныя крыніцы створаны ў 20 ст. у 20-60 гг., існуюць яны ў асноўным на заходнееўрапейскіх мовах. Крыніцы можна размеркаваць на асноўныя групы: а) навуковыя і папулярныя манаграфіі, якія ў больш-менш сістэматызаваным выглядзе прадстаўляюць гісторыю сусветнай бібліяграфіі: Г.Шнэйдэр «Кіраўніцтва па бібліяграфіі», Л.Н.Мальклес «Бібліяграфія», К.Р.Сімон «Гісторыя замежнай бібліяграфіі»; б) навуковыя публікацыі па гісторыі бібліяграфіі асобных краін і рэгіёнаў: М.В.Здобнаў «Гісторыя рускай бібліяграфіі да пачатку XX веку», М.В.Машкова «Гісторыя рускай бібліяграфіі пачатку XX веку: (Да кастрычніка 1917 г.)", Ю.Корпала «Нарыс гісторыі бібліяграфіі ў Польшчы» і інш.; в) даследаванні развіцця асобных галін і відаў бібліяграфіі: Т.Бестэрмэн «Пачатковыя стадыі развіцця пералічальнай бібліяграфіі», В.Фукс «Юрыдычная бібліяграфія. Гісторыя і сістэма галіновай юрыдычнай бібліяграфіі» і інш.; г) падручнікі, у якіх маецца адасоблены матэрыял па гісторыі бібліяграфіі: І.В.Гудоўшчыкова, К.В.Лютава «Агульная замежная бібліяграфія», «Бібліяграфія. Агульны курс»; д) публікацыі, у якіх фрагментарна прадстаўлены гістарычны матэрыял, дадзеныя з раздзела хронікі. Тэарэтыка-метадалагічны ўзровень большасці крыніц не адпавядае сённяшнім патрабаванням бібліяграфічнай навукі.

4. Вучэбны дапаможнік павінен мець дакладную, даступную мову. Патрабуецца ўключэнне ілюстратыўнага і нагляднага матэрыялу, схем і табліц.

**Саломка А.І.,**
**дацэнт**

## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ КНІГІ»

Ад узроўню прафесійнага майстэрства бібліятэкара залежаць не толькі інфарматызаванасць грамадства, але і развіццё культуры народа, яго духоўнае багацце. Важнейшым і неабходным элементам прафесійнага майстэрства бібліятэкара з'яўляецца прафесійная кніжная культура. У будучага бібліятэкара яна фарміруецца пад уздзеяннем усіх спецыяльных дысцыплін, сярод якіх пачэснае месца заўсёды адводзілася гісторыі кнігі. Спачатку яна вывучалася толькі ў гістарычным аспекце, затым былі ўведзены тэарэтычныя праблемы кнігазнаўства. Зараз, у выніку асэнсавання месца кнігазнаўства ў навуцы аб дакуменце, узнікла неабходнасць выкладання двух самастойных дысцыплін: дакументазнаўства і гісторыі кнігі.

Курс «Гісторыя беларускай і сусветнай кнігі» ў такім гучанні ўзнік на ФБІС у 1992/93 навучальным годзе. У працэсе яго выкладання паўстае шэраг праблем. Разгледзім некаторыя з іх.

Курс складаецца па сутнасці з двух самастойных частак. На кожную адводзіцца па 30 лекцыйных гадзін, хаця ўжо пры першым разглядванні бачна розніца ў іх аб'еме. Назва курса дае некаторую магчымасць яго рэгуляваць. Так, гісторыя беларускай кнігі, а не кнігі на Беларусі, як гучала раней, арыентуе на пашырэнне вывучаемага матэрыялу за лік беларусікі (экстэрыёрыкі). У другой частцы курса - гісторыі сусветнай кнігі - патрэбна абмежаванне матэрыялу. Зараз робіцца спроба вырашыць гэтую праблему шляхам раскрыцця агульных заканамернасцей узнікнення і тэндэнцый развіцця кнігі, асвятлення асноўных з'яў у гісторыі функцыяніравання кнігі ў свеце. Разам з тым больш дэталёва разглядаюцца ўзнікненне і існаванне кніг у тых краінах, якія гістарычна цесна звязаны з Беларуссю ці развіццё кніг у якіх уздзейнічала (уздзейнічае) на кніжную культуру Беларусі. І ўсё ж частка курса патрабуе павелічэння колькасці гадзін лекцыйных заняткаў.

Найгалоўнейшай з праблем з'яўляецца поўная адсутнасць падручніка па першай частцы курса і частковая - па другой. Для таго каб зняць яе вастрыню, вядзецца работа па назапашванню неабходнай літаратуры і іншых матэрыялаў у спецыяльным кабінеце. Сіламі выкладчыка і студэнтаў ствараецца картатэка навуковай і метадычнай літаратуры па гісторыі кнігі, якая будзе шмат шырэй спіса літаратуры, вылучанай для абавязковага засваення па курсу і будзе выкарыстоўвацца ў вучэбнай і навуковай рабоце студэнтаў. Збіраецца фонд рэфератаў на розныя тэмы па гісторыі кнігі, якія рыхтуюцца студэнтамі дзённага і завочнага навучання. Шукаюцца шляхі выкарыстання фонду аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі бібліятэкі універсітэта у вучэбным працэсе, правядзення на яго аснове лабараторных заняткаў, студэнцкай навуковай работы. Знаёмства з фондам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ